**Спіс экзаменацыйных пытанняў па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці «Гісторыя» завочнай (дыстанцыйнай) формы навучання (1 семестр)**

1. Кліматычныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі ў эпоху сярэдняга палеаліта і навуковая праблема існавання неандэртальцаў на тэрыторыі Беларусі.
2. Змены клімату на тэрыторыі Беларусі ў Верхнім палеаліце. Насельніцтва верхнепалеалітычных стаянак Бердыж і Юравічы: гаспадарка і ўмовы жыцця.
3. Пасляледавіковы перыд. Пачатак рассялення чалавека на тэрыторыі Беларусі ў фінальным палеаліце.
4. Мезаліт на тэрыторыі Беларусі. Змены клімату. Археалагічныя культуры, гаспадарка насельніцтва.
5. Неаліт на тэрыторыі Беларусі. Змены клімату. Археалагічныя культуры, гаспадарка насельніцтва.
6. Рассяленне індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку. Археалагічныя культуры індаеўрапейцаў. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва Беларусі.
7. Паўночнабеларуская культура бронзавага веку. Творы першабытнага мастацтва.
8. Жалезны век цэнтральнай і паўночнай Беларусі. Насельніцтва культур днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі.
9. Жалезны век паўднёвай Беларусі. Мілаградская, зарубінецкая, кіеўская археалагічныя культуры.
10. Славянскія археалагічныя культуры поўдня Беларусі: пражская і Лукі Райкавецкая. Гаспадарка насельніцтва.
11. Балты на тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі ў раннім сярэдневякоўі. Археалагічныя культуры тыпу Банцараўшчыны-Тушамлі.
12. Рассяленне славян на тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі. Крывічы (археалагічная культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў).
13. Дрыгавічы на тэрыторыі Беларусі. Арэал рассялення, гаспадарчыя заняткі.
14. Радзімічы на тэрыторыі Беларусі. Арэал рассялення, гаспадарчыя заняткі.
15. Полацк і Полацкая зямля ў IX–X стст.
16. Тураў і Тураўская зямля ў IX–X стст.
17. Палітычная гісторыя Полацка і Полацкай зямлі ў XI ст. Полацкія князі Ізяслаў Уладзіміравіч, Брачыслаў Ізяславіч, Усяслаў Брачыславіч.
18. Раздрабленне Полацкай зямлі на ўдзелы-княствы ў XII ст.

19. Барацьба Полацка з крыжакамі.
20. Палітычная гісторыя Турава і Тураўскай зямлі ў XI–XII стст.
21. Землі Беларускага Падняпроўя ў X–XII стст. Летапісныя Магілёў і Гомій.
22. Землі Беларускага Панямоння ў X–XII стст. Летапісныя Гародня і Ваўкавыск.
23. Землі Беларускага Пабужжа ў X–XII стст. Летапіснае Бярэсце.
24. Язычніцтва на тэрыторыі Беларусі ад першабытных часоў да сярэдневякоўя.
25. Распаўсюджванне хрысціянства на тэрыторыі Беларусі. Хрысціянскія асветнікі (Торвальд Вандроўнік, Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клімент Смаляціч).
26. Манументальнае сакральнае дойлідства на тэрыторыі Беларусі ў XI–XII стст. Полацкая і Гродзенская школы дойлідства.
27. Распаўсюджванне пісьменства на тэрыторыі Беларусі ў XI–XII стст. Манастырскія бібліятэкі. Помнікі эпіграфікі. Археалагічныя знаходкі.
28. Сельская гаспадарка на тэрыторыі Беларусі ў XI–XII стст. Стан сялянства.
29. Сацыяльны склад насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў XI–XII стст. паводле пісьмовых крыніц (князі, свецкія і духоўныя феадалы, вольнае і залежнае насельніцтва).
30. Тапаграфічная структура і забудова сярэдневяковага горада на тэрыторыі Беларусі. Колькасць гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў X–XII стст. паводле пісьмовых крыніц.